немаўлятка. Толькі зноў — сумненне: кім жа стаў гэты Віктар Платонаў? Пакінуўшы ў оперы магутны, адкрыты фінал быкаўскай аповесці, мы далучылі сюды сімвалічную сустрэчу Леўчука з яго мінуўшчынай. Выходзяць на сцэну героі, што жыццём сваім і смерцю заваявалі права запытацца: кім стаў ты, народжаны ў агні вайны, сын партызанскай мадонны? Якое яно, маладое пакаленне, чый мірны дзень аплачаны крываваю цаной?

Прызнаюся, рэпетыцыі — ад першых да апошняй — праходзілі вельмі пакутліва. Цікавасць і захопленасць перамяжаліся адчуваннем, што эстэтыка ўсяго опернага тэатра «не кладзецца» на творчую эстэтыку Васіля Быкава. Падобнага трывожнага адчування ў час пастаноўкі перажываць яшчэ не даводзілася, хаця оперы на ваенную тэматыку ставіў.

Складана было арганізаваць на сцэне незвычайную для оперы плынь дзеяння, якое «перакідваецца» з сучаснага дня ў акалічнасці мінулага. Але галоўнае — дамагчыся асаблівага жыцця акцёра ў гэтых абставінах. І раней даводзілася мне задумацца над тым, як абудзіць і абвастрыць у акцёра адчуванне жыццёвай праўдзівасці. Бывае, артыст, які цудоўна ўпраўляецца з плашчом і шпагай, захоплена і пераканальна ўвасабляе старадаўняга героя, зусім бездапаможным аказваецца ў оперы на сучасны сюжэт. Вось і цяпер даводзілася рабіць заўвагі выканаўцам, якія, прыміруючыся да сцэны ў партызанскім лагеры, румяняць твар, фарбуюць вусны... Навошта?! Хіба наш твор — пра гэткіх бадзёрых і ружавашчокіх «герояў»?... Разам з тым, было вельмі прыемна, калі на рэпетыцыях, яшчэ ў класе, усчыналася гутарка не толькі паводле оперных падзей. Калі, напрыклад, Аркадзь Саўчанка ўспамінаў як ён, хлапчук, бедаваў у вайну, страціўшы браціка, а Ірына Шыкунова расказвала пра тое, як з ёю, дзяўчынкай, у ваенную часіну маці блукала па балотах, — тады адчувалася найкаштоўная вартасць акцёраў — абуджанасць чалавечага «я» ў творчасці.

Нялёгка, з дапамогаю канцэртмайстраў і дырыжора Уладзіміра Машэнскага, асвойвалася выканаўцамі своеасаблівая музычная мова оперы, нялёгка вырашаліся сцэнічныя задачы. Бо сцэна — густанаселены свет (знята ў спектаклі ўся трупа). У ім дзейнічаюць нашы сучаснікі, да якіх звяртаецца са сваёй памяццю Ляўчук; у ім з'яўляецца вобраз каханай Ціханава — Яніжкі; у ім паўстаюць і цені спаленых вяскоўцаў, і загінуўшая сям'я Грыбаеда.

Названа опера «Сцяжынаю жыцця». Яшчэ ў працэсе работы мы адмовіліся ад назвы «Воўчая зграя». Не таму, канечне, што ў тэксце лібрэта я скарыстаў некаторыя думкі з іншых быкаўскіх твораў. А таму, што акцэнту на вобразе воўчай зграі не рабілі, бо зацікавіліся сімвалічным сэнсам вобраза партызанскага сына Віктара Платонава. Назва прыйшла не адразу. Наладжвалі нават спаборніцтва між сабою: «Сын партызанскай мадонны», «У агні вайны», «Хто ты?»... Усё не задавальняла. Тады пазваніў Быкаву і праз дзень ён прапанаваў свой спіс, з якога і выбралі канчатковую назву. Партызанская сцежка... Героі спектакля дзейнічаюць у імя жыцця... Гэта ёсць і ў назве.

Опера паводле Быкава—першая. І зразумела, што нашы калектыўныя хваляванні і адказнасць — асаблівыя. І перад гэтай прэм'ерай як ніколі трывожыць пытанне: ці пачуюць нас, ці зразумеюць тыя, хто прыйдзе ў тэатральную залу?

Запісала С. БЕРАСЦЕНЬ.

яшчэ, будзе пераадольваць пэўны жанрызм асобных сцэн у «Варварах», узмоцніць народны характар смеху ў камедыі Бамаршэ, агульная пастановачная стылізацыя якой знойдзена і выканана тонка і не выклікае пярэчанняў. Агульнае ўражанне — у гэтых творах найбольш поўна выявіліся акцёрскія таленты. Вобразы, створаныя А. Гаманюком, І. Мацкевічам, К. Перапяліцам, А. Логінавым, Р. Белацаркоўскім, А. Грозевым, В. Жакавым, А. Крайнюковым, Г. Токаравым,—безумоўныя дасягненні. Прамоўцы выказалі пажаданне, каб такія ж адчувальныя змены ў кірунку паглыблення псіхалагічнага малюнка ролі і большай мастацкай самастойнасці адбываліся і ў жаночай частцы трупы тэатра. Выканаўцы жаночых вобразаў у «Варварах» і «Жаніцьбе Фігара», у прыватнасці, Л. Сінельнік, Т. Валчэцкая, Н. Ганчарэнка, С. Патапава, Р. Нячэхіна, праявілі ўменне па-мастацку даследаваць заблытаны і складаны лёс жаночага характару, вынаходліва і дынамічна іграюць у камедыйных сітуацыях, але ім варта яшчэ ўдасканальваць майстэрства на ўзроўні павышанай патрабавальнасці, якая робіцца цяпер штодзённай і паслядоўнай, трэба спадзявацца, — нормай творчага жыцця ў калектыве брастаўчан.

Прафесар У. Няфёд, прыгадаўшы лепшыя спектаклі тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі на працягу трыццаці шасці гадоў яго дзейнасці, звярнуў увагу на адсутнасць у цяперашнім рэпертуары сучаснай п'есы з гераічным характарам станоўчага героя ў цэнтры. Вопыт, які на сучасным этапе тэатральнага руху набывае калектыў у спасціжэнні маштабных твораў класікі, у пастаноўцы такіх маючых адбыцца прэм'ерных спектакляў, як «Рэвалюцыйны эцюд» М. Шатрова і драматычнай паэмы «Хамуціус» А. Куляшова, дае падставу спадзявацца на больш актыўнае супрацоўніцтва тэатра і з аўтарамі п'ес аб сённяшнім дні, аб людзях стваральнай працы нашых дзён. Наогул, падкрэсліў прамоўца, варта смялей выяўляць самастойнасць мастакоўскага мыслення менавіта тады, калі трупа аб'ядноўваецца вакол надзённай праблематыкі. Калі мець на ўвазе непажаданыя рэцыдывы мінулага перыяду, то трэба сказаць, што пэўная тэндэнцыя «ісці за гледачом» пранікла і ў імкненне «ісці за аўтарам» пакорліва і індыферэнтна, спасылаючыся на так званую аўтарскую волю. Тэатр, адкрываючы заслону, кожны раз пацвярджае сваё права на дыялог з сучаснікам — сваёй прынцыповай ідэйнай пазіцыяй, узроўнем майстэрства, мастацкай добрасумленнасцю. Нельга мірыцца са становішчам «пракатнай арганізацыі», якая «толькі» ставіць спектаклі і паказвае іх загадзя «арганізаванаму» гледачу. Партыйны дух і наступальнасць у ідэалагічным уздзеянні на тых, хто сёння запаўняе залу, маюць дзейсны характар, калі рэалізуюцца ў канкрэтную з'яву мастацтва, у спектакль, у вобраз.

●

У рабоце пасяджэння прэзідыума праўлення БТА ў Брэсце прыняла ўдзел намеснік загадчыка аддзела культуры ЦК КПБ П. П. Украінец.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

Аляксею КАРПЮКУ — 60

60 год — вядомаму беларускаму пісьменніку Аляксею Карпюку. З нагоды юбілею праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала яму прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Аляксей Нічыпаравіч!

Вашы сябры і калегі па пяру шчыра, ад усяго сэрца віншуюць Вас з шасцідзесяцігоддзем!

Святло з Усходу, якое прыйшло на былыя заходнебеларускія землі ў незабыўны верасень 1939 года, паказала Вам, тады дзевятнаццацігадоваму юнаку, дарогу да навукі. Здабыць яе перашкодзіла вайна, якую Вы сустрэлі студэнтам Навагрудскага педтэхнікума.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Вы былі сярод тых, хто вёў падпольную барацьбу супраць ворага. Зняволенне ў гітлераўскі канцлагер не зламала Вашай волі як савецкага патрыёта. Вырваўшыся адтуль, Вы арганізоўваеце ў родных мясцінах партызанскі атрад, камандаваць якім даручаюць Вам. Пасля вызвалення Савецкай Беларусі ад акупантаў Вы ўступілі ў дзеючую Савецкую Армію і з баямі дайшлі да Берліна. За ўдзел у баявых дзеяннях Вы атрымалі высокія ўрадавыя ўзнагароды — ордэны Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны І ступені,



баявыя медалі. Урад Польскай Народнай Рэспублікі ўзнагародзіў Вас Залатым Крыжам ордэна «Віртуці мілітары».

Вярнуўшыся ў родны край, Вы зноў сталі студэнтам, на гэты раз Гродзенскага педагагічнага інстытута. Багаты жыццёвы вопыт, здабыты на партызанскіх сцежках і на фронце, разбудзіў у Вас талент пісьменніка. Каля трыццаці гадоў плённа працуеце Вы на ніве мастацкай літаратуры.

Аповесці «У адным інстытуце», «Данута», «Пушчанская адысея», раман-быль «Вершалінскі рай» сведчаць пра непаўторнасць Вашага таленту, імкненне да вострасацыяльнай канфліктнасці, да знітавання ў адно мастацкага вобраза і яркай публіцыстычнай думкі.

У пасляваенны час Вы ўдала спалучаеце творчую працу з нястомнай арганізатарскай дзейнасцю спачатку на ніве народнай асветы, пасля ў друку, у галіне наладжвання замежнага турызму і нарэшце як сакратар абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР па арганізацыі творчага працэсу і згуртаванні літаратурнай моладзі.

Жадаем Вам, дарагі Аляксей Нічыпаравіч, на доўгія гады моцнага здароўя, усё той жа няўрымслівасці ў добрых пачынаннях на карысць далейшага развіцця сацыялістычнай культуры.

Новых творчых пошукаў Вам, багатых здабыткаў і вялікага шчасця!»

Далучаючыся да гэтага віншавання, рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» жадае Аляксею Нічыпаравічу светлага вясновага настрою, плёну ў творчай працы.

БЫЦЬ КАРЫСНЫМ ЛЮДЗЯМ

Карпюк адносіцца да тых пісьменнікаў, чыя творчасць народжана жыццём у самым прамым і непасрэдным сэнсе.

Умовы, у якіх прайшло дзяцінства і юнацтва, прайшла маладосць будучага пісьменніка, былі выключна складанымі, поўнымі суровых выпрабаванняў. У 1934 годзе чатырнаццацігадовы хлапчук трапляе пад суд за спробу ўцячы з буржуазнай Польшчы ў СССР. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі ўваходзіць у склад падпольнай дыверсійнай групы, у 1943 годзе быў арыштаваны, апынуўся ў канцлагеры Штутгоф. Цудам адтуль уцёк. Актыўна змагаўся ў партызанскіх атрадах. З войскамі Савецкай Арміі прайшоў шлях ад Варшавы да Берліна. Пасля вайны вучыўся ў інстытуце, настаўнічаў у вёсцы, быў журналістам... З 1947 года — член КПСС.

Першы твор, аповесць «У адным інстытуце», быў надрукаваны ў 1953 годзе. Карпюк піша заўсёды пра тое, што таксама ці інакш звязана з ягоным асабістым лёсам, з лёсам блізкіх яму людзей. Творы вылучаюцца моцнай насычанасцю рэальнымі жыццёвымі фактамі. У іх грунтоўная аўтабіяграфічная (гэта найчасцей) або дакументальная аснова, па-мастацку як бы непрыхаваная, выяўленая адкрыта. Пісьменнік непасрэдна прысутнічае ў творы; ён не хаваецца ад чытача за «падстаўных асоб» (сваіх герояў), не ўтойвае сваіх адносін да таго, пра што піша — людзей, фактаў, падзей.

Жыццё — гэта бясконца мноства сітуацый, канфліктаў. Для пісьменніка важна іх убачыць у гістарычнай сувязі і ўзаемаабумоўленасці, адчуць і выявіць іх духоўны змест і сэнс, ісці ў глыбіню. Такі падыход у найбольшай ступені магчымы ў адносінах да таго, што спазнана табой асабіста, стала па сутнасці тваім. Узаемаадносіны Карпюка-пісьменніка з рэчаіснасцю менавіта такія. Факты, сітуацыі, вобразы, настрой пераважнай большасці твораў пісьменніка, у першую чаргу такіх, як аповесці «У адным інстытуце», «Данута», «Пушчанская адысея», «Па кветку шчасця», спачатку былі ім як бы рэальна «перажыты», потым ужо набылі мастацкае ўвасабленне, больш шырокі і агульна значны змест і сэнс. Увогуле ж ёсць усе падставы сцвярджаць, што Карпюк сябе пісьменніка знайшоў у сабе чалавеку, грамадзяніну. Ідэйны напал, вышыня этычных патрабаванняў, праўдзівасць і разам нязменнае рамантычнае імкненне да святла і прыгажосці, якасці, якія так прывабліваюць у творчасці пісьменніка, народжаны гераічнай барацьбой народа. Сам ён. узмужнеў у гэтай барацьбе, загартаваўся. У ёй — крыніца ягонай духоўнай устойлівасці, чалавечай годнасці, крыніца агульназначнасці таго, пра што піша. Глыбокае карэнне, што лучыць мастака з родным краем, з народам, жывіць ягоную творчасць, напаўняе жыватворнымі сокамі зямлі, робіць патрэбнай і карыснай людзям.

Серафім АНДРАЮК.

Міколу РАКІТНАМУ — 60

Вядомаму беларускаму пісьменніку Міколу Ракітнаму — 60. У сувязі з гэтым праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала яму прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Мікалай Ісакавіч!

Вам шэсцьдзесят гадоў і мы, Вашы сябры і калегі па літаратурнай працы, горача віншуем Вас як старэйшага майстра беларускага апавядання.

Пачаўшы сваю творчую дзейнасць з апавядання, апублікаванага ў франтавым друку, Вы не здраджваеце гэтаму жанру вось ужо на працягу больш чым трыццаці гадоў.

Па адукацыі Вы — мастак, і ў душы мастак, здольны заўважаць у нашай рэчаіснасці адметныя рысы самаадданага служэння савецкага чалавека свайму народу, роднай партыі, Радзіме. Вы тонка адчуваеце неўтаймоўнае жаданне нашых сучаснікаў змагацца з усім, што замінае яшчэ ў нашым каму-

ністычным будаўніцтве. Вашы творы, у большасці сваёй востраскжэтныя і драматычна напружаныя, заўсёды знаходзяць шырокі водгук у чытача.

Самастойнае жыццё Вам давялося пачынаць радавым Савецкай Арміі. Вялікую Айчынную вайну Вы прайшлі як артылерыст цяжкімі баявымі дарогамі Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў. Дэмабілізаваўшыся з радоў арміі, Вы працавалі некаторы час у рэспубліканскай газеце «Звязда», а пасля на працягу вось ужо трыццаці гадоў нястомна працуеце рэдактарам аддзела ў часопісе «Беларусь».

Жадаем Вам, дарагі Мікалай Ісакавіч, на доўгія гады добрага здароўя, творчай бадзёрасці, новых пошукаў і вялікіх здзяйсненняў».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае Мікалаю Ісакавічу доўгіх год жыцця, няўрымслівага творчага гарэння.

ТАКОЕ СЭРЦА

Свежа, гучна заявіў пра сябе Мікола Ракітны яшчэ з першых сваіх апавяданняў, якія больш за трыццаць гадоў таму назад пачалі друкавацца на старонках беларускіх рэспубліканскіх выданняў. Поспеху спрыяла тое, што будучы пісьменнік прайшоў вялікую жыццёвую дарогу, папрацаваўшы і рахункаводам, і загадчыкам хаты-чытальні, і зведаўшы жахі вайны. Відаць, гэтым можна тлумачыць выхад з друку з пэўнымі прамежкамі зборнікаў ягоных апавяданняў «Ранняй вясной», «Вячэрнія зоры», «Сельскоры», «Пад адным дахам», «Была вясна», «Сярод людзей сваіх», «Вясковыя навелы», «Выбраныя апавяданні»...

М. Ракітны піша пра тое, што добра ведае, што бачыў, перажыў, што не пакіне ў спакоі нічыё сэрца. У лірычную споведзь пісьменнік натуральна ўводзіць песню, голас народны. Таму, прачытаўшы некалькі яго апавяданняў, назаўсёды запамінаеш і манеру, і стыль, і характар пісьма, якія цяжка збыцаць з творамі іншых аўтараў.

У большасці твораў М. Ракітнага, як правіла, з праблем вытворчых вырастаюць праблемы маральныя, сямейныя, хоць пісьменніка нельга назваць бытавіком. У гэтым пераконваешся, перачытваючы апавяданні «На прыстані», «Такое яе сэрца», «Зацвіталі яблыні», «Шахцёр», якія выяўляюць кола тэм, вобразаў, цікавасцей празаіка.

Любоўным аўтарскім паглядам прыцягвае апавяданне М. Ракітнага «Млын», прысвечанае маці. Тут не толькі верыш кожнаму слову празаіка, але разам з ім перажываеш трагедыю, якая напаткала сям'ю. Мужчынскае галашэнне выпісана лаканічна, пачуццёва насычана, глыбока. Здаецца, бачыш гаротнага чалавека, які поўзае на камянях каля загінуўшага брата, тармосіць яго за доўгія, шырока раскінутыя ногі, быццам хоча разбудзіць, прыпадае вухам да грудзей і выкрыквае з плачам:

— Браточак родны! Вунь твае дзеткі сядзяць. Зірні... Куды ж ты так рана, у трыццаць гадочкаў?..

Дваццаць гадоў таму назад чыталася апавяданне, а помніцца ўсё да драбніц, як уласна табою перажытая гісторыя. І так можна гаварыць пра большасць твораў М. Ракітнага, напісаных таленавітай рукой, сагрэтых цяплом сэрца. Яркія дэталі, запамінальныя штрыхі дапамагаюць жыва ўявіць час, у які жылі героі, узнавіць эпоху пасляваенных пераўтварэнняў у краіне.

Хочацца верыць, што пасляюбілейныя гады будуць для М. Ракітнага парой новых пошукаў і значных адкрыццяў на ніве беларускага апавядання.

Валянцін МЫСЛІВЕЦ.